# Кожны трэці…

*Змітрукевіч Аксана*, студэнтка групы 10114118, АТФ
Кіраўнік канд. гіст. навук, дацэнт *А.В. Лепеш*

У перакладзе з нямецкай мовы Der Krieg азначае вайна. Пэўна, недарма і ў нямецкай мове вайна – гэта крык. Крык душы. Крык як жаданне жыць! Як жаданне любіць і марыць! Крык як жаль і боль ад разбітых надзей і скалечаных чалавечых лёсаў.

Пра вайну я ведаю няшмат. Усё, што мне давялося – гэта прачытаць пэўную колькасць мастацкіх і навукова-папулярных кніг па гэтай тэме. А хіба дастаткова для таго, каб поўнасцю адчуць і зразумець наступствы вайны, прачытаць кнігу? Магчыма, так, але больш кранальная і зразумелая кожнаму будзе яго асабістая гісторыя, гісторыя яго продкаў. У мяне таксама ёсць такая гісторыя. А дакладней, у маёй бабулі Філіповіч Яўгеніі Паўлаўны:

“Калі мне было гадоў 15, мой бацька, з якім і яго трэцяй жонкай (маёй мачахай) я жыла ў вёсачцы Котчына, адправіў мяне везці для партызанаў абоз з харчаваннем. У той час, а гэта быў 1943 год, наша вёсачка была ў нямецкай акупацыі. Ехаць мне і яшчэ некалькім дарослым з нашых мясцін трэба было ноччу. А справа гэта была адказная і вельмі небяспечная, ехалі праз лес. Страшна было. Сказаць, што мною ў той момант рухаў нейкі патрыятызм, складана. Бо што мне было, нейкіх 15 гадоў, дзіця. Хіба я што-небудзь разумела?

Заданне па падвозу партызанскаму атраду, які дзейнічаў у нашай мясцовасці, харчавання, было выканана.

Калі мы вярталіся дадому праз лес Казібор, што за 15-18 кіламетраў ад Котчына, святлела. Раптам пачуўся нейкі гул. Хутка зразумелі, што гэта ляцелі нямецкія самалеты. Над калонай яны развярнуліся і пачаўся абстрэл.

Конь, на якім я ехала, выратаваў мне жыццё! Такая разумая жывёліна! Ён падбег да бліжэйшага дрэва і лёг на зямлю, а я лягла побач. Самалёты ў той момант паспелі ўжо зрабіць некалькі заходаў.

А я і мой конік ляжалі і не рухаліся… Пасля гэтага абстрэлу некалькі чалавек былі параненыя і нават забіты, сярод іх былі і мае знаёмыя…

Удзячнасць. Вось, што адчула да гэтай жывёлы. Атрымліваецца, што не толькі людзі змагаліся і ўратоўвалі адзін аднаго, але і жывёлы выратоўвалі жыццё.”

Усім вядомы беларускі пісьменнік Васіль Быкаў гаварыў: "Вайна надзіва сляпая ў адносінах да людзей і далёка не па іхніх заслугах распараджаецца жыццямі". Немагчыма спрачацца з такімі дакладнымі і да болю праўдзівымі словамі. Хто выбіраў вайну? Народ хацеў забойства, жахаў, маральнага і фізічнага калецтва? Вайна зрабіла з людзей параненых калек. Прымусіла жывёльным інстынктам стаць на першы план. Вочы адных яна запоўніла крывёю і жаданнем чыніць жах. А вочы іншых бачылі і людзі адчувалі страх, іх сэрцы ачарсцвелі да чужой бяды, бо іх бяда была ім “бліжэй да іхняй скуры”. Ці можна іх асудзіць за гэта? Ці варта іх асуджаць? Мы не Богі і мы не перажылі такі вопыт. І, сапраўды кажучы, нікому не хачу пажадаць такога жыццёвага вопыту.

“Ты, пэўна, ведаеш, – працягвала бабуля, – што ў час абстрэлаў і бамбёжак людзі хаваліся ў моцных і нізкапабудаваных укрыццях. У нашай вёсцы таксама было такое месца. Гэта быў мясцовы свіран з каменю і гліны. Тады Чырвоная Армія адступала праз нашу тэрыторыю, а немцы наступалі. Былі бамбёжка і артабстрэл. У гэты час жыхары нашай ваколіцы хаваліся ў тым самым свіране Сказаць, што было страшна, нічога не сказаць. Страшэнны гул, узрывы снарадаў і крыкі зусім маладых хлопцаў, якія былі вымушаны аддаваць свае жыцці. Гэтым хопцам яшчэ б жыць… Але ж..

Усе мы сядзелі і трасліся: чакалі, што будзе далей. І вось у адзін момант да нас забег зусім малады хлопец, што быў адзеты ў ваенную форму. Вочы яго былі напужаныя і разгубленыя. Было зразумела, што ён таксама шукаў сховішча ад бамбёжкі.

Жанчына, што хавалася разам з намі, сказала яму: “Ідзі адсюль. Бяжы. З-за цябе і нас могуць забіць. Бяжы туды”.

І ён пабег. Туды…Пад бамбежку і абстрэл.

Невядома, што здарылася з ім далей. Ці знайшоў гэты хлопча, дзе схавацца. Ці можа атрымаў кулю і стаў безжыццёвым целам… Зараз пра гэта ўжо не даведаешся. Але ўсё ж адна магчымасць на выратаванне ў яго была. І гэтая магчымасць была страчана, адабрана суайчыннікам”.

Вайна – гэта крык. А жыцці – ахвяры… А кожны трэці загінуў… А колькі скалечана фізічна, знічтожана маральна …